**Палівка В.У.,** студэнт
навуковы кіраўнік – Матвейчык С.В.

# МАЛАДЗЕЧАНСКАЯ ШКОЛА ВЫЦІНАНКІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Маладзечанская выцінанка актыўна пачала развівацца ў 1987 годзе ў дзіцячай мастацкай школе, куды дырэктар В.А. Таракан запрасіў працаваць Вікторыю Мікітаўну Чырвонцаву на выкладанне саламянай аплікацыі і саломапляцення. Майстрыха ўмела ўпраўляцца з ільном, саломай і іншымі традыцыйнымі матэрыяламі.

Для працы з саломай не было ні матэрыялу, ні прыстасаванняў, ні інструментаў. Прыйшлося з нечага пачынаць. Яна выбрала самае лёгкае і даступнае: папера, нажніцы і дзіцячая фантазія, а вынік – выцінанка. Амаль забыты від народнага мастацтва. Успомніла пасляваеннае дзяцінства, матчыну навуку. Паказала гэты цуд дзецям, ён выклікаў такое захапленне і энтузіязм, што стала ясна – трэба вучыць. Пачалася ўпартая праца, пошук літаратуры, роспыты старых людзей. Веды назапашваліся, а потым з‘явілася першая праграма па выцінанцы, якая прызначалася для малодшых класаў і старэйшых вучняў. Праграма ўяўляла сабой паступовае вывучэнне і авалоданне мастацтвам выцінанкі па пэўнай сістэме: ад простага да больш складанага. Малодшыя рэзалі фіранкі, карункі, сурвэткі, сілуэты зайчыкаў, коцікаў, птушак, кветак. Спрабавалі кампазіцыі на казачныя сюжэты. Старэйшыя дзеці, якія былі больш вопытныя ў майстэрстве (лепш валодалі алоўкам, нажніцамі), знаёміліся з казкамі, паданнямі, песнямі, каб у далейшым выкарыстаць сюжэт для сваёй будучай работы.

У 1988 годзе ў часопісе ―Мастацтва Беларусі‖ выйшаў артыкул Яўгена Міхайлавіча Сахуты аб беларускай выцінанцы. Гэта быў штуршок да далейшай працы над выцінанкай у дзіцячай мастацкай школе г. Маладзечна. Паступова выдаваліся кнігі па сімволіцы народных арнаментаў. З іх пачыналася праца над

складанай кампазіцыяй, дзе кожны выразаны сілуэт, элемент мае пэўнае тлумачэнне і сімвалічны сэнс.

У 90-я гады XX ст. нацыянальна-культурнае адраджэнне выклікала абуджэнне цікавасці да народнай мастацкай спадчыны. Развіццё народнага мастацтва разглядалася як вырашэнне духоўнай задачы нацыянальнага культурнага адраджэння Беларусі. У 1992 годзе дзякуючы выставам у Маладзечна , Мінскай вобласці і Мінску, адміністрацыя горада Маладзечна зацікавілася школай. З цягам часу былі складзены вучэбныя праграмы, запрошаны самыя лепшыя настаўнікі, ішло ўдасканаленне праграмы па выцінанцы. Вывучалася міфалогія, фальклор, філасофскія канцэпцыі, сімвалізм выяў, беларускі арнамент, асаблівасці народнага строю, стылізацыя, кампазіцыя. Даваліся заданні на стылізацыю фігуры чалавека ў народным строі, на стварэнне кампазіцый з выявай архітэктурных збудаванняў.

Наступным крокам у развіцці беларускай выцінанкі стала стварэнне аддзялення дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў 1995 годзе на базе Маладзечанскага дзяржаўнага музычнага каледжа ім. М.К.Агінскага, куды перайшла працаваць Чырвонцава В.М. Менавіта тут склаліся найбольш спрыяльныя ўмовы для зараджэння пакуль адзінай сучаснай школы гэтага віду дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў нашай краіне.

Каштоўны вопыт зносін з дзецьмі і моладдзю, назапашаны Чырвонцвай В.М. за перыяд працы ў дзіцячай мастацкай школе горада Маладзечна, спецкласе пры Маладзечанскім гарвыканкаме, на аддзяленні дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, быў аформлены ў праграму па выцінанцы, зацверджаную Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь у 2001 годзе для выкладання гэтага прадмета на спецыялізаваных аддзяленнях мастацкіх вучылішч. У праграму былі ўключаны тэарэтычны і практычны курс. Разам з засваеннем тэхнічных прыёмаў, асноў кампазіцыі і тэорыі колеру, праграма прадугледжвала знаёмства з традыцыйнай культурай беларусаў, міфалогіяй і сімволікай арнаментальных матываў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Маладзечанская школа выцінанкі выпускае мастакоў, якія выдатна разумеюць, як народнае мастацтва нашай краіны ўплятаецца ў кантэкст сусветнай культуры. Важнай асаблівасцю навучання з'яўляецца пошук прыкладнога значэння выцінанкі, шмат увагі надаецца месцу выцінанкі ў сучасным мастацкім і бытавым асяроддзі. Пры ўсёй разнастайнасці сюжэтаў і формаў можна вылучыць асноўныя прынцыпы, якія аб'ядноўваюць прадстаўнікоў школы:

-дэкаратыўная выразнасць;

- сімвалізм;

- цікавасць да гісторыі арнаменту, сімволікі і семіётыкі традыцыйнай культуры;

- апора на нацыянальныя традыцыі;

- распрацоўка пэўных сюжэтных ліній;

- эксперыменты з матэрыялам, колерам і формай падачы (афармлення) работ;

- вяртанне ўтылітарнай ролі выцінанкі побач з дэкаратыўнай (месца ў сучасным інтэр'еры, афарміцельскім мастацтве).

Маладзечанскіх майстроў заўсёды адрознівала веданне асноў дэкаратыўнай кампазіцыі. Пры навучанні студэнтаў важнай задачай з'яўляецца ўтрымаць іх у межах стылю, паколькі майстар, які вырас не ў традыцыйным асяроддзі, а таксама без разумення базавых паняццяў «стылізацыя», «арнамент», «дэкаратыўнасць» і т. п., імкнецца ў сваёй творчасці да выяўленчасці, аддаючы прыярытэт рэалістычным вобразам. Праца педагогаў на пачатковым этапе шмат у чым накіравана на развіццё ў вучнях разумення розных стылістычных напрамкаў у народным і сучасным дэкаратыўным мастацтве. У выніку ў маладога майстра з'яўляецца здольнасць «трымаць плоскасць», што ўласціва шматлікім творам старадаўняга народнага мастацтва.

Такім чынам, закладзенае ў аснову навучальнага працэсу «паглыбленне ў традыцыю» дало свой вынік: у працах маладзечанскай школы мы бачым не проста сюжэты, за імі стаіць пэўны культурны пласт, які чытаецца як тэкст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Акрамя таго, у маладзечанскай выцінанцы склаўся свой шэраг тыповых сюжэтаў. Найбольш папулярныя з іх - святы народнага каляндара, персанажы беларускай міфалогіі, архетыпічныя вобразы традыцыйнага мастацтва, народныя касцюмы беларусаў, вобразы архітэктуры ў выцінанцы, традыцыйныя кветкавыя і дывановыя кампазіцыі і г.д. Толькі абапіраючыся на духоўныя традыцыі свайго народа можна стварыць сапраўды нацыянальныя творы. Кажучы пра ролю эксперыменту ў творчасці прадстаўнікоў школы, важна заўважыць яго мэтазгоднасць. Выкарыстанне каляровай і таніраванай паперы, фольгі, празрыстай плёнкі, праца з аб'ёмам, падсветкай - усё гэта прысутнічае ў пэўна ступені практычна ў кожнай працы. Няхай гэта будзе папяровы вітраж, лямпа або шырма – ўсё абмежавана пачуццём меры. Разуменне таго, што жывучасць той ці іншай мастацкай з'явы залежыць ад яе запатрабаванасці ў асяроддзі мастацтвазнаўцаў або заказчыкаў, прыводзіць майстроў да пастаяннага творчага пошуку.

Традыцыі маладзечанскай школы выцінанкі развіваюць дочкі Вікторыі Мікітаўны Чырвонцавай Наталля і Лізавета, якія ў цяперашні час выкладаюць на аддзяленні дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і самі займаюцца творчасцю. Менавіта іх працы шмат у чым заклалі асновы стылістычных асаблівасцяў маладзечанскай школы.

Творы Наталлі Чырвонцавай - заўсёды непаўторныя і добра пазнаюцца. Майстрыха аддае перавагу працы з суцэльным лістом паперы, праразаючы ў ім элементы рознай формы. Набор элементаў складваецца ў фактуры, а фактуры ўмела зліваюцца ў кампазіцыю. «Ярыла», «Дрэва пазнання», «Малітва», «Лета» - усе гэтыя работы прасякнуты глыбокім філасофскім зместам. Сіметрычныя, кампазіцыйна ўстойлівыя, яны адначасова як быццам пульсуюць. Лізавета Чырвонцава аддае перавагу працы з фігуратыўнымі кампазіцыямі і выкарыстоўвае антрапаморфныя вобразы. Ёй належыць цэлая галерэя міфалагічных персанажаў, герояў беларускіх казак і легенд. Старажытныя духі і бажаство, якім пакланяліся ў мінулым нашы продкі, аб'яднаны ў адзіны цыкл

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каляндарнага года, дзе кожнаму персанажу адпавядае свой час - месяц, калі выяўляюцца яго найбольш характэрныя рысы.

Майстры з Маладзечна не адзін раз станавіліся дзяржаўнымі стыпендыятамі па рэкамендацыі Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, яны - ўдзельнікі і пераможцы конкурсных мерапрыемстваў. Нездарма менавіта ў Маладзечна з 2000 года знайшоў прапіску абласны свята-конкурс майстроў выцінанкі «Папяровыя карункі». На першым конкурсе асобным дыпломам «За шматгадовую працу па развіцці народных традыцый выцінанкі» была адзначана Вікторыя Мікітаўна Чырвонцава.

У гісторыі развіцця традыцыйнага народнага рамяства рэдка здараецца так, каб роля канкрэтнай асобы сур'ёзна паўплывала на развіццё якога-небудзь віду. Традыцыйная культура ва ўсіх яе праявах часта ананімная. Аднак, калі казаць пра развіццё беларускай выцінанкі, то цяжка пераацаніць ролю Вікторыі Мікітаўны Чырвонцавай у гэтай справе, яе талент як педагога і арганізатара. Вучні Чырвонцавых пасля заканчэння вучобы раз'язджаюцца па сваіх рэгіёнах і працягваюць традыцыі школы, іншыя паступаюць у вышэйшыя навучальныя ўстановы, але ніхто не застаецца абыякавым, не забывае настаўнікаў і вопыт атрыманы ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве.

1. Кацар, М.С. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка / М.С. Кацар. – Мінск: БелЭн, 1996 – 208 с.

2. Молодечненская школа вытинанки. История и художественные особенности [Электронный ресурс].-Рэжым доступу: https://wycinanka-by.livejournal.com/3915.html.- Дата доступу 18.03.2018.

3. Сухая, Н.А. Пуцяводная зорка – мастацтва. Беларуская культура сёння. Гадавы агляд / Н.А.Сухая. - Мінск: БелДІПК, 2004.

4. Чырвонцава, В.М. Выцінанка. Праграма для аддзяленняў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва мастацкіх вучылішчаў / В.М. Чырвонцава. - Мінск: БелДІПК, 2001. – 20 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ